Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 24 (53) Пятніца, 22-га ліпня 1927 г. м. Вільня. Год II.

Беларускае Слова

Цана нумару 20 грош.

...рыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі ...унізмам.—Нацыянальная царква.—Краевая згода.—Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ „ 3 „ 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Выпярадкі ў працы.

Правадыр Польшчы Пілсудзкі сказаў неяк надзвычай глыбокія словы: „за выпярадкамі ў жалезе і крыві; прыйдуць выпярадкі ў працы". Гэтыя глыбока разумныя словы немцы здужалі ўжо правясьці у жыцьцё: праіграўшы вайну — выпярадкі крыві і жалеза, — яны не здаліся, і ў той момэнт, як пераможцы спачылі на лаўрах, немцы ўзяліся за працу, за працу ў надзвычай цяжкіх варунках, пасьля гэткай цяжкай, ды яшчэ нешчасьлівай вайны. І мы бачым, што сяньня немцы аказаліся пераможцамі!

Польшча гінула ад дэмагогіі, ад унутранага неладу, ад леві і хабарства, якое прыкрывалася шовіністычным псэўда-патрыятызмам і барацьбою з неістнуючымі „ворагамі".

Сойм і Сэнат — законадаўча творчыя палаты — патанулі ў дзебрах партыйніцтва і дэмагогіі. Высуваныя гэтымі палатамі ўрады, ці то парлямэнтарныя, ці пазапарлямэнтарныя, — залежылі ад бязлічных соймавых партыяў і былі няздольны да творчай, энэргічнай, адналітай працы. Прышоў да ўлады праз вагонь і кроў Пілсудзкі, які не скасаваў і не разагнаў палатаў, але зусім выразна прызваў іх да парадку і запрапанаваў ім пакінуць дэмагогію і партыйніцтва, і прыступіць да згоднай, творчай працы.

Сойм і Сэнат, якія яшчэ гэтак нядаўна на чало Дзяржавы высунулі Вітаса, падпарадкаваліся магутнаму голасу вялікага чалавека Польшчы. Аднак-жа часовае аздараўленьне, наступіўшае ў палатах пасьля маёвага перавароту, хутка зьмянілася на старую соймавую калатню, рожныя выкрутасы і комбінацыі бязлічных збанкрутаваўшых соймавых партыяў і клюбаў. Сойм выразна імкнуўся ўсімі сіламі дабіцца свайго папярэдняго соймаўладцтва, не гледзячы на тое, што нішто іншае, як толькі гэтае соймаўладцтва давяло да кашмарных маёвых падзеяў і амаль не давяло Дзяржаву да гібелі.

Але вось у Сойм зьявіўся... паручнік Зацьвіліхоўскі з паперкай п. Прэзыдэнта і Сойм быў раптам, сярод шуміхі і прамоваў. распушчаны на неакрэсьлены тэрмін!

Пілсудзкі яшчэ раз ляснуў па гонару парлямэнту і распусьціў парлямэнт, які нічога ня творачы, прашкаджаў яму ў яго працы. Пілсудзкі ня толькі на словах, але на дзеле рашыў кінуць усе здаровыя, творчыя сілы краю на працу, чуючы сваім надзвычайным інстынктам, што толькі ў працы, цяжкай, няпрыкметнай штодзённай працы ёсьць ратунак Польшчы.

Тое, што рабілася і робіцца з польскімі партыямі і групамі, робіцца і ў нас у Заходняй Беларусі з групамі і партыямі беларускімі. Мы бачым, што ў Сойме Бел. пасольскі клюб пабіўся на паасобныя варожыя групы. Мы бачым, што ў цэнтры палітычнакультуральнага і грамадзкага беларускага жыцьця — Вільні разнагай прыняў характэр нейкага фарсу. Істнуюць *два* Сельзаюзы, з якіх адзін аднаго ня прызнае, а якіх у сваю чаргу ані воднага *ня ведае і ня прызнае* сялянства. Істнуюць *два* нацыянальных камітэты, зноў адзін другога не прызнаючы, адзін аднаго за *ашуканства і машэнства* цягнучы да суду. І зноў абодва далёкія і незразумелыя для грамадзянства, асабліва сельскага, з сваімі хатнімі клутнямі, лаянкамі, судовымі справамі і г. д.

А беларуская сялянская цэліна ляжыць, пустуе і дзічэе, зарастаючы зельлям, у той час, як інтэлігэнтныя сілы ваюючь на сьмерць паміж сабою...

І ў гэты час празвучэў голас групы людзей, *якія*, як маршалак Пілсудзкі, пастанавілі прыняць удзел у выпярадках у працы, але на роднай беларускай ніве. І пасьля гарачых слоў было прыступлена да працы. Ускалыхнулася родная, забытая „высокімі" палітыкамі вёска, пайшла культурная і грамадзкая праца. А як прыйшоў патрэбны мамэнт, дык група гэтая стала на чале шэрэгаў свэіх сябраў і прыхільнікаў, і першая перамога, першы пасьпех у выпярадках працы дапяла: беларусы маюць свае беларускія рады гмінныя, маюць сваіх *першых беларускіх войтаў!*

Нехай Сель-Саюз № 1 лае і ганьбіць Сель-Саюз № 2 і наадварот!..

Нехай Бел. Нац. Ком. № 2. у сьмяротнай барацьбе душыць Бел. Нац. Ком. № 1 і сам душыцца!...

Жыцьцё не стаіць, народ не чакае!

З тоўшчы народнай падняліся сьвежыя, новыя сілы, якія вядуць народ па яго цяжкім шляху змаганьня і працы.

У Вільні заложаны з ініцыятывы „Бел. Нац. Выбарнага Камітэту" у лучнасьці з Бел. Нац. Радай і Бел. Нац. Партыяй „Беларускі Камітэт па справам самаўрадаў". Камітэт гэты ўжо прыступіў да працы. Усьлед за вы-выпускам адозвы Камітэт прыступіў да арганізацыйнай працы. У хуткім часе будуць скліканы павятовыя зьезды беларускіх самаўрадавых працоўнікоў. З усімі сваімі быўшымі сябрамі, інструктарамі і прыхільнікамі, з якіх шмат хто трапіў да радаў гмінных, а нават і да войтаў, — Камітэт мае сталую субязь. Але *ня ўсе* беларускія *новыя радныя* трымаюць сувязь з *адзіным* „Беларускім Камітэтам па справам самаўрадаў". *Абавязкам кожнага* чэснага беларускага самаўрадавага працаўніка ёсьць зараз-жа ўвайсьці ў цесную сувязь з сьвім самаўрадавым камітэтам. Сувязь гэтую можна навязаць, як безпосрэдня з віленскай цэнтраляй Камітэту, гэтак роўным чынам і з прадстаўнікамі комітэту на провінцыі.

Дык, Беларусы Радныя, на выпярадкі ў працы на шчасьце для нашага Народу!

Камунікат
Цэнтр. Бел. Нац. Выб. К-ту.
Першыя беларускія войты.

У Красным на адбытых выбарах да ўраду гм. Красносельскай заступнікам войта выбраны гр. Рован — са сьпіску нацыянальнага.

На войта выбраны стары войт п. Шыманкевіч, якім да гэтага часу гміна была задаволена.

ЖЫРАВІЦКАЯ ГМІНА, рад. 10.

Белар. нацыян, — 6.
„ грамад. — 1.
Абшарнікаў — 2.
Асаднікаў — 1.

Слонімскі павет.

Пасярод грамадаўскіх радных ідзе перакартоўка, — некаторыя, якія стаялі на чале Грамадаўскіх сьпіскаў, асобы паважныя і нічога супольнага з Грамадаўскай працай ня маючыя і пастаўленыя ў сьпіскі Грамадаўцамі толькі дзеля лоўлі галасоў — цяпер аддзяляюцца і пераходзяць у нашыя шэрэгі.

Палітычная афарбоўка радных „na razie" выглядае гэтак:

1. Шмат сябраў К. П. З. Б.
2. За імі другое мейсца займаюць беларусы нацыяналісты.
3. Асаднікі Пілсудчыкі са Związku Naprawy Rz. P.
4. Абшарнікі — Z. L. N.
5. Клер — адзін ксёндз — N. D.
6. Жыды — „Пале-Сыон" і „Бунд".

Аб іншых групах, як „Б. Сель-Саюз", і новапаўсталая партыя Бона, Шапэля — зусім ня чуваць і прыхілнікаў няма.

Сяляне цяперака ясна кажуць: — трэба быць або нацыяналістам, або камуністам — і цэнтра ня прызнаюць...

Выбары ў урады гмінныя цяперака адбываюцца. Хто выбраны, вестак яшчэ няма. Выбары ў Кастравіцкаую Гмінную Раду запратэставаны і будуць вызначаны новыя.

Палітычны агляд.

Бяда ніколі ня прыходзіць адна. Гэта лепш усяго спраўджаецца на прыкладзе бальшавікоў, якія апынуліся проста ў бязвыходнай сытуацыі. Да поўнага паражэньня ў Кітаі, зьмены фронта Афганістану, Пэрсыі і Турцыі, скандалу ў Лёндане, бязплоднасьці перагавораў з Францыяй, наварота сьпіною да Масквы ўсей Заходняй Эўропы, новага выступленьня апазыцыі ўнутры камуністычнай партыі, новай хвалі „контр-рэвалюцыі" і „контр-тэрору" далучыўся яшчэ

сэпаратызм радавай Украіны і Беларусі.

Гэта зьявішча трэба разглядаць як адну з найпаважнейшых небясьпек для далейшага істнаваньня радавай ўлады ў Расеі.

Даўшы на паперы ўсё, і грамадзкія свабоды, і самаакрэсьленьне народаў,—бальшавікі фактычна не далі свайму народу нічога Яны думалі, што выкрэсьліўшы назову „Расеі" з сьвятовай гэографіі і гісторыі і,заняніўшы царскі цэнтралізм у дзесяць раз бязлітаснейшым радавым, папанцуе задушыць пры помачы тэрору здаровыя нацыянальныя імкненьні да праўдзівай вольнасьці і незалежнасьці насяляючых цяперашняю тэрыторыю радавай Расеі рожных нацыянальнасьці. Але памыліліся маскоўскія чырвоныя дэспаты, ня падлічылі тэй абставіны, што законы гісторыі і жыцьця неперамożны і, што ня ім з іх подласьцю, дэструкцыйнай працаю і бязсільлям павярнуць кола гісторыі. Што аднымі кпінамі няможна вырашыць нацыянальнай праблемы, якая ў наш час прадстаўляе адну з найбольш трудных сьвятовых праблемаў. Беларуса, украінца, грузіна, армяніна можна толькі часова, пад пагрозаю сьмерці, прымусіць забыць, што ён ёсьць беларус, украінец і грузін. Але, ледзь прадставіцца адпаведны момэнт, гэтыя народы зачнуць свае правы на запраўдную нацыянальную незалежнасьць. І цяпер акурат наступіў такі момэнт, калі гэтыя народы рашылі выступіць з актыўным дзеяньнем.

У папярэднім нумары нашай газэты было пададзена, што

маскоўскі ўрад згадзіўся на раўнапраўе ўсіх моваў у Радавай Украіне.

Але ці не запозно. Дорага чырвонае яечка на вялікдзень. Дорага тое, што даецца не пад прымусам. Усім добра вядома, што гэта зроблена маскоўскімі дыктатарамі не дабравольна, а пад уплывам унутраных і вонкавых цяжкіх абставінаў. Згадзіўшыся на гэта, бальшавікі адначасна арыштуюць сотні украінскіх нацыянальных дзеячоў па абвінавачаньню іх ў „контр-рэвалюцыі", зьмяшчаюць з пасады старшыню беларускай рады народных камісараў у Менску — Чэрвякова і арыштуюць масы іншых беларускіх нацыяналістаў на ўсей тэрыторыі „незалежнай Беларускай рэспублікі".

Але ці ня гульня гэта з вагнём на парахавой бачцы? Ці не апошняя гэта стаўка „па банку"?

Каго маскоўскія чырвоныя дыктатары вінавацяць у „антыдзяржаўнай" шкадлівай працы? — камісара народнай асьветы на Украіне камуніста Шумскага і старшыню рады народных камісараў у Беларусі камуніста Чэрвякова. Ці ўцямілі яны самі, што гэта значыць? Ці-ж для Масквы нарэшце ня ясна, што

здаровая нацыянальная ідэя перамогла камуністычныя глупыя лятуценьні.

Украінскі, беларускі, грузінскі сялянін ніколі ня быў камуністам і ня будзе. Гэта яны даказываюць цяперашнім мардаваньнем ідэовых камуністаў. Але мы бачым, што нават ідэовыя камуністы, стоячыя на чале камуністычнай ўлады, зварачываюць з ложнага камуністычна-інтэрнацыянальнага шляху на здаровы нацыянальны. І ніякія бальшавіцкія экспрэсыі, ніякія арышты і звальненьні з пасадаў галоўных нацыянальных дзеячоў Украіны і Беларусі не запужаюць украінскага і беларускага народаў і ня спыняць іх узмацнёнага руху ў напрамку поўнай нацыянальнай незалежнасьці, з чым несаўмясьціма істнаваньне маскоўскай цэнтралістычна - камуністычнай дыктатуры. Гэта небясьпека большая, чым „англійская". І яе ня можна будзе заглушыць, ці адхіліць ніякімі страхамі вонкавых небясьпек, як гэта часта ўдавалася бальшавікам да гэтай пары.

Не маглі пагрэць сваіх рук маскоўскія падпальшчыкі і пад

„венскаю рэвалюцыяй",

якая ўжо закончылася, пакуль зьляцеліся чырвоныя камуністычныя вораны з Масквы і Бэрліна. Наагул ня можна сабе нават ваабразіць нічога болш бязсэнсовага, як „венская рэвалюцыя", якая разыгралася у працягу трох дзён ад 15 да 18 ліпня. Каб лепш прадставіць сабе яе бязсэнсовасьць, трэба указаць на тыя труднасьці, з якімі Аўстрыя змагалася у працягу 6 — 7 гадоў, пакуль, нарэшце, не ўпарадкавала свае фінансы і гаспадарку. Зьменшыўшыся пасьля праігранай вайны і рэвалюцыі з 56 мільённай Аўстра-Вэнгэрскай дзяржавы да разьмераў 6 мільённай крошачнай дзяржавы з $2^1/_2$ мільённай сталіцаю, якую ня ў сілах была спачатку пракарміць страна, гэта пачвара з вялізарнаю галавою і маленькім, кволым тулавішчам, якім яе стварылі тварцы вэрсальскага трактату, Аўстрыя ў пачатку казалася зусім няздольнаю да незалежнага істнаваньня, як дзяржава. Гэта асабліва яскрава падкрэсьлівала і да гэтай пары падкрэсьляе Нямеччына, у вэймарскай конституцыі ў якой нават ёсьць параграф аб прылучэньні яе да Vaterland'у. І каб толькі аслабіць нямецкія апэтыты, Ліга Народаў узяла на сябе руплівасьць аб аўстрыйскіх фінансах. Пры яе дапамозе

была выдана Аўстрыі міжнарадовая пазыка,

над выдаткамі якой апекаваўся асобны камісар, пастаўлены ад Лігі Народаў, голяндэц Цымерман. Затым пад яго кантролям была зроблена „разгрузка" сталіцы, зьменшана галава, наагул зьменшаны бюракратычны апарат, ураўнаважаны бюджэт, устабілізавана валюта. І ўся Эўропа, і нават Амэрыка радаваліся гледзячы, як гэта хворае вэрсальскае дзіця паволі станавілася на ногі і крэпла. Жыцьце ў Аўстрыі і самай Вене, гэтай заўсёды ўсьміхаючайся, першай пасьля Парыжу, красавіцы Эўропы, з кожным днём папраўлялася, гандлёвыя абароты 6 мільённай Аўстрыі пачалі перавышаць гандлёвыя абароты 30 міл. Польшчы. Адносіны Аўстрыі з усімі суседзямі устанавіліся надзвычай шчырыя. Ніхто з адлучыўшыхся частказ быўшай Аўстра-Вэнгэрскай імпэрыі ня мсьціў ёй, як насьледніцы дарэвалюцыйнай ўлады за грахі сваіх папярэднікаў. У гэтай мазольнай, але скутэчнай працы львіную частку высілку палажыў амаль ня зьменяемы ксёндз канцлер Зэйпель.

І вось, калі ўжо Аўстрыя была прызнана жэнэўскім, „кансіліуме" палітычна-фінансавых гаспадароў зусім здароваю і здольнаю да самастойнага істнаваньня, калі быў зьняты міжнарадовы фінансавы кантроль, трэба было невядома адкуль найсьці гэтай

Конфэрэнцыя палітычных банкротаў.

БЕЛАРУСКІ
СЯЛЯНСКІ САЮЗ.

30 VI 1927 г.

№ 50.

м. ВІЛЬНЯ,
Завальная 6.

Запрашэньне „Сельсаюза“ на конфэрэнцыю.

Яго Міласьці Паважанаму
Грамадзяніну *Гардзею Антону*
у *в. Літва*

„Дня 23 і 24-га ліпня г. г. ў Вільні адбудзецца конфэрэнцыя *запрошаных (!)* сяброў Беларускага Сялянскага Саюзу.

У сувязі з гэтым просім Вас прыехаць на конфэрэнцыю або дэлегаваць ад вашага павету (*цэлага павету! Рэд.*) іншага сябру саюзу або сымпатыка, якін жадае працаваць на карысьць Бацькаўшчыны пад сьцягама Беларускага Сялянскага Саюзу.

Кошты падарожы незаможным сябром будуць звернуты (*хто даў сродкі?! Рэд.*)

Пачатак конфэрэнцыі 23-га ліпня а 12 газдіне у дзень.

Далучаючы да гэтага марку на адказ, ветліва просім (*прасі, пр сі!. Рэд.*) неадкладна адпісаць нам хто мае прыехаць (*чакай, чакой..,Рэд.*). на конфэрэнцыю“

Більдзюкевіч
Сэкрэтар Цэнтральнага
Камітэту.

В. Рагуля
Старшыня Цэнтральнага
Камітэту.

АД РЭДАКЦЫІ: Гэта запрашэньне выдрукавана на машынцы лацінкаю, а мы друкуем яго кірыліцаю без усякай зьмены арфаграфіі.

А вось адказ:

Да п. Старшыні Белар. Нацыян. Рады.

Я, ніжэй падпісаны сябра Беларускага Сялянскага саюзу, прашу пана Старшыню не адмовіць напісаць у Вашай паважанай газэце „Беларускім Слове“ маё пісьмо гэткага зьместу:

Прашу пана Старшыню Беларускай Нацыянальнай Рады зрабіць распараджэньне аб высылцы мне поўнага камплекту літэратуры Беларускай Нацыянальнай Партыі. Маю перакананьне, што толькі пад сьцягам Нацыянальнай партыі нам беларусам можна нешта здабыць. **Дзеля гэтага пакідаю Бел. Сельсаюз з яго пекнай, шырока размалёванай праграмай і з правадырамі, якія яшчэ перад выбарамі ў Сойм абяцалі шмат салодкіх рэчаў Беларускаму сяляніну.** Павадыры Сельсаюзу ня толькі ня здолялі абараніць інтарэсы Беларускага народу, „Чаротнага мужыка“, але яшчэ горш пашкодзілі яму.

Да гэтага пісьма далучаю ліст ад цэнтральнага камітэту Беларускага Сялянскага Саюза за № 50, у якім мяне запрашаюць на конфэрэнцыю на дзень 24 ліпня г. г. У пісьме напісана, каб я даў адказ, хто мае прыехаць на конфэрэнцыю Дык вось гэты адказ ў газэце „Беларускае Слова“:

„На канфэрэнцыю ня прыедзе ніхто, бо нам ані канфэрэнцыі, ані Сель-саюз праз 5 гадоў нічога не зрабілі ні ў Соўме, ні ў гмінных самаўрадах, і нічым нам не памаглі. Са шчырых, праўдзівых беларусоў, я пэўны, што ніхто не паедзе, і на канфэрэнцыі гэнай будуць толькі такія сельсаюзьнікі, якія былі пададзены ў „Беларускім Слове“ ад 22 траўня № 16, пад загалоўкам „Партрэты сельсаюзьнікаў“; з такімі сябрамі не хочу мець нічога супальнага. З прычынаў вышэйпаданых я выхаджу з Сельсаюза і партыйны білет N 13 зьнішчажаю Адначасна заяўляю, што жадаю прымкнуць да Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі і працаваць на карысьць беларускага сялянства пад адзіным Нацыянальным сьцягам. Буду старацца пераконваць сялянства, што трэба гуртавацца ў адзіны моцны фронт Нацыянальнай партыі. Тады толькі мы зможам здабыць палепшаньне для Беларускага Народу.

З пашанай

18 ліпня 1927 г.

Антон Гордзей.

„рэвалюцыйнай буры“, якою засталіся незадаволены самі яе ініцыятары - сацыялісты. Трэба падкрэсьліць, што

сацыялісты маюць у Аўстрыі вельмі моцны уплыу.

„Чырвоная Вена“ — гэта гордасьць II амстэрдамскага сацыялістычнага інтэрнацыянала. Напрыклад нашы сацыялісты заўсёды бралі Вену, як прыклад гаспадаркі сацыялістаў, бо большасьць радных венскага магістрату складаюць сацыялісты — 78 на агульную лічбу 120 радных. На чале рады стаіць сац. Зэйц. У нацыянальным сабраньві ці парламэнце сацыялісты маюць 72 мандаты, а іншыя партыі разам 85. Другою найбольшаю палітычнаю партыяю ў стране пасьля сацыялістаў лічыцца партыя хрысьцьянскіх дэмакратаў Зэйпеля, зусім умяркаваная, па сваей праграме падобная на нямецкую партыю каталіцкага цэнтру канцлера Маркса. Гэткім чынам партыйная рознь у Аўстрыі ня вельмі моцная. Тут няма нямецкага нацыяналістычнага шавінізму, хаця ў апошнія гады як хадэкі, гэтак сама і сацыялісты

адкрыта выказаліся за прылучэньне (Anschluss) да Нямеччыны,

з тэй рожніцаю, што Зэйпель хацеў гэта зрабіць на варунках магчыма большай дэцэнтралізацыі ад Бэрліна і Прусіі, а сацыялісты наадварот. На гэтым грунце ў сутнасьці і паднялася гэтая бязсэнсовая бура, Сацыялісты хацелі скампрамітаваць Зэйпеля, каб захапіць у свае рукі ўладу і затым аказаць свой уплыў на далейшы ход палітычных падзеяў. Але яны не прабачылі таго, што калі двое б'юцца, дык заўсёды скарыстае толькі трэці. І у даным выпадку найбольшыя падзеі пакладалі на венскую „рэвалюцыі“ Бэрлін і Масква, якія ідуць рожнымі шляхамі, але заўсёды да аднэй мэты. Для Бэрліна патрэбна была рэвалюцыя і апанаваньне Вены камуністамі, каб мець повад для „навядзеньня парадку“, пасьля ён надзеяўся налажыць на Аўстрыю сваю руку. Але па пастанове Францыі, Італіі і Малай Антанты Немцы заўважылі, што ў гэты мамэнт ім не пашанцуе. І яны асьцюдзянелі.

Для Масквы вельмі патрэбна было ў цяперашні цяжкі для яе момэнт, паказаць, што яшчэ не прапала надзея на рэвалюцыю ў Эўропе. А, калі нават і не пашанцуе „раздмухаць эўрапэйскай рэвалюцыі“, дык хоць падарваць эканамічны дабробыт Аўстрыі, што зьяўляецца найбольшым ворагам камунізму. Дзеля гэтага пры першых вестках аб „рэвалюцыі“ у Вене маскоўскі інтэрнацыянал зараз-жа разослаў адозву, каб венскі пралетарыят трымаўся да канца, што зараз-жа будуць высланы грошы і г. д. А з Масквы і Бэрліна на аэраплянах выляцелі камуністычныя „спэцы“ па арганізацыі рэвалюцыі. Але спазьніліся, бо самі венскія сацыялісты, якія да гэтай пары лічыліся найбольш разважнымі, заўважылі, што яны могуць апынуцца забаўкаю ў чужых руках і страціць усе тое, што было дабыта доўгаю, мазольнаю працаю і пастанавілі зьліквідаваць гэту бязсэнсовую рэвалюцыю, якая і бяз гэтага дорага каштуе і будзе мець вельмі цяжкія вынікі. Гэткім чынам, дзякуючы прасьвятленьню сацыялістычных палоў у Вене, наступіла нармальнае жыцьцё, толькі час ад-часу нарушаемае выступленьнямі камуністаў, адтрымаўшых інструкцыі з Масквы і Бэрліну „раздмухаць Аўстрыйскую рэвалюцыю“. Але і на гэты раз сарвалося.

N.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

ХВАРОБА МІНІСТРА ЗАЛЕСКАГА.

Міністр заграмічных справаў захварэў на малярыю. У апошнія дні наступіла пагаршэньне.


ВЫЕЗД ДА МАСКВЫ ПАСЛ. ПАТЭКА.

Польскі пасланнік у Маскве заўтра выяжджае з Варшавы да Масквы з адноснымі інструкцыямі польскага ўраду.

ГАНДЛЕВЫ БАЛЯНС ЗА ЧЭРВЕНЬ.

У чэрвені было прывезена тавараў да Польшчы на суму 275,760,000 зл., а вывезена 196,789,000 зл. Гэткім чынам гандлёвы дэфіцыт дасягае 46 міл. зл.

ЧАЛАВЕК ЗАМЕСТ КУЛІ.



Новаю сэнсацыяю зьяўляецца армата, выдуманая італьянцам Зэцыні, якая стрэляе ня ў людзей, а чалавекам, як куляю. Пры першым вопыце ў Турыні Зэцыні быў выстрэляны на вышыню 100 мэтраў, а затым упаў непашкоджаным на спэцыяльна прыгатаваную сетку.

З Заграніцы.

СЬМЕРЦЬ РУМЫНСКАГА КАРАЛЯ.

20 ліпня памёр румынскі кароль Фэрдынанд. Дзяржаўная ўлада перайшла да Рэгэнтскай Рады.

КОНФЭРЭНЦЫЯ АБ РАЗАРУЖЭНЬНІ НА МОРЫ.

Англійская дэлегацыя ў Жэнэве высунула праэкт, паводле якога лічба крэйсараў для Англіі і Амэрыкі акрэсьляецца ў 12, пры агульным танажы ў 550,000 тонаў, Японія з свайго боку прапануе, каб гэта лічба для Англіі і Амэрыкі складала на 10 з танажам у 450,000 тонаў.

АРЫШТЫ ПРЫХІЛЬНІКАУ ПАНГАЛОСА ў АФІНАХ.

У Афінах арыштавана шмат марскіх афіцэраў, прыхільнікаў быўшага дыктатара гэн. Пангалоса, якія рыхтаваліся скінуць цяперашні ўрад

ГЭН. СЯМЕНАУ ТВОРЫЦЬ АНТЫБАЛЬШАВІЦКІЯ АТРАДЫ.

З Пэкіна паведамляюць што гэн. Сямёнаў заключыў умову з гэн. Чанам, прыхільнікам Чанг-Тсо Ліна, паводле якога абязуецца прадставіць яму расейскі атрад у 5,000 чал. для ўдзелу ў ваенных дзействах шангтанскай арміі. Сямёнаў знаходзіцца ў Шанхае. дзе вярбуе дабравольцаў. Гэткая-ж вярбоўка праводзіцца на ўсім Д. Усходзе.

ЛІКВІДАЦЫЯ КАМУНІСТЫЧНАГА УРАДУ У КІТАІ.

З Ханькоў паведамляюць, што гэн. Го-Тіен зрабіў пераварот, скінуўшы камуністычны ўрад, і заняў Ханькоў і Га-Гіянг з жал.-дарожнаю лініяю і паважнейшымі стратэгічнымі пунктамі.

„Здрада“.

Выканаўчы камітэт камітнэрну апублікаваў цыркулярную адозву, у якой жаліцца на „здраду ханькоўскага ўраду старым прынцыпам, стаўшы контр-рэвалюцыйнаю сілаю“. Дзеля гэтага камінтэрн жадае, каб кітайскія камуністы тойчас выйшлі з ураду, зваліўшы ўсю адказнасьць за будучыя вынікі на „здрадніцкі урад“. Гэткім чынам самі бальшавікі прызналі сваю поўную паражку ў Кітаі і пачалі адступленьне.

Маскоуская „падзяка“.

Галяндзкі Урад раскрыў на востраве Яве новую камуністычную агітацыю, якая падтрымліваецца значнымі грашовымі сьродкамі Мэтаю агітацыі зьяўляецца адлучэньне галяндзкіх калёніяў ад мэтраполіі. Агітацыя вядзецца асабліва сярод туземных салдат. У некалькіх мейсцох дайшло да крывавых спатычак. Шмат арыштавана. Галяндзкі ўрад нездаволены, што галяндзкія фінансавыя сфэры прыйшлі з грашоваю запамогаю для радаў, якія падтрымліваюць на гэтыя грошы агітацыю ў галяндзкіх калёніях

АХВЯРЫ ЗЕМЛЯТРАСЕНЬНЯ ў ЕРУСАЛІМЕ.

Паводле аканчальнага падлічэньня землетрасеньне ў Ерусаліме выклікала: 500 забітых, 3,000 раненых і 6,000 дамоў зьнішчаных. Матэрыяльныя шкоды дасягаюць 850,000 фунтаў штэрл.

Пашырайце роднае слова!

Маленькі фэльетон.

Старыя знаёмыя пры працы на тым баку.

Пасьвячаецца аўтару артыкула „Кавэрды і Кумпан'я“ у газ. „Савецкая Беларусь“.

У Менскім патаемным „сов.-кабачку“, што на „Нова-стройцэ“ на вуліцы „імяні таварышкі Калантай“ (б. Нова-Красная).

Праз вакяніцы разам з электрычным сьвятлом выбіваліся на вуліцу і шумныя гукі пьяных галасоў... Два дзяржы морды — вышыбалы, — тыпу праўдзівых „чэкістаў“ — ахоўвалі ўваход ад няпрошаных госьцей і прахажваючы ля дзьвярей вока пільна даглядалі, каб ніхто не нарушвала супакой і ціту, вуліцы і кумпанейства ў самым „сов-кабачку“...

Але навакол было ціха.. Толькі з рогу Ракаўскае вуліцы паказалася фігура нейкага запазьніўшага пешахода, які паволі падымаўся на горку і быццам кіраваўся ў напрамку да іх. Быў пьяны. Шоў хіляючыся і, залажыўшы адну руку заборт старадаўняга сурдута, нешта марматаў сабе пад нос..

Вышыбалы настаражыліся... Але той, падыйшоўшы да іх сам затрымаўся і зірнуўшы з падалбу адным вокам — сперша гола сна ікнуў, а пасьля адплюнуўся .. але маўчаў.—Праходзь, праходзь, таварыш!... Не затрымлівайся! — Сумрачна варушыліся дзяржы-морды, — тутака не для цябе!.

Падыйшоўшы выпраставаўся, падняў галаву і з пагардай скрывіўся. .

— Свалачьё! — падумаў — а... а вы хто такія ёсьць?! — працадзіў нарэшце і ізноў адплюнуўся,— прэч з дарогі! Гэта я іду!..

Але адказ быў не спадзеваны, — ён адчуў як зазьвянела яму ў левым вуху і як нешта быццам апаліла ўсю шчаку Пасьля нечыя рукі ўхапілі яго за каршыла і паднялі ў паветра...

Ен закрычэў, забрыкаў нагамі і пачаў вырывацца. . „Дрэнь“?! — праняслося ў галаве — зусім, як калісь у Вільні. І прышлося бы кепска і ня ведама чым бы гэта кончылася, каб на звон аплявухі і ягоных крыкаў ня выскачыла з сов-кабачка некалькі асоб. Першым пазнаў спазьніўшага госьця сам гаспадар — таварыш Лагіза...

— Стойце, таварышы!... Чакайце, чакайце!. закрычэў ён — гэта-ж наш ганаровы госьць?!..Гэта-ж наш паважаны таварыш Міхась?! Гэта-ж ён — былы пасол Польскага Сойму, а вы яго ў рынштох?!.

— Міхась, Міхась тутака!.. — Пранеслося па „сов-кабачку“...

— Міхась прыйшоў!.. давайце яго сюды!..

— Слава яму?!

— Няхай жыве Міхась!...

Няхай жыве наш знаўца Польшчы?!..

— Слава аўтару сэнсацыйных спраў беларускіх у Польшчы!..

— Гарэлкі! Гарэлкі яму!..

— Давайце сюды кварту!.

— Не!. Гарніц, гарніц цягніце!..

Але ня ўсе прысутныя аднясьліся гэтак прыхільна да гэтае дэманстрацыі, — адны сядзелі маўчком, іншыя пачалі шыкаць і сьвітаць, а за некатарымі столікамі на'т досіць голасна пачуўся шэпт:

— Хавайце, браточкі, хавайце хутчэй свае закускі!. А то пачне зараз, як у Варшаве калісь, хадзіць паміж столікаў і з чужых талерак закусваць ..

— Кажуць быццам паліякі яго за гэта і з Сойму выпярлі?!..

— Не!.. Не палякі!.. а свае беларусы выпярлі, — занадта ўжо кампраматаваў іх, што ні дзень, то скандал, то морду яму паб'юць, то ў рынштаку валяецца ..

— А ў Сойме, дык, — кажуць, — аніводнае прамовы не сказаў!.

— „Дзікім“ называўся...

Ну ведама дзікі, — калі цьвярозы — маўчыць, а як п'яны, дык зараз скандал...

—Бачыце?!. А ў нас ў якім гонары!.. І сапраўды, калі Міхась паказаўся на салі— сустрэцілі яго воплескамі і п'яным „інтэрнацыяналам“.

З падпухнуўшым вокам, ад толькі што атрыманай аплявухі, ён быццам нічога, — ухмыляўся сабе ў вавесь свой рот і адкланіваўся на прывітаньні. Прызвычаяны да гэтакіх выпадкаў у Польшчы, дзе білі яго і свае беларусы і палякі, білі і вайскавыя і цывільныя, і на урачыстасьцях, і пры звычайных абставінах, і сам не аднаразова калечыў сабе твар аб брукі віленскія і варшаўскія —ён і да сёньняшняга выпадку аднёсься, як да нечага звычайнага і ўпарадку дзённага і каб не палілася толькі шчака і ня было-б апухшае вока, дык і жадаць больш ня трэ'было-б нічога...

І ён здаровым вокам прыплюшчыўся, зіркаў па століках і мяркаваў куды, дзе і да якой капмпаніі прысуседзіцца...

— Аа!.. — радасна ўскрыкнуў, убачыўшы за дальнім столікам сваіх прыяцеляў — „заходнікаў“ — іду, іду! — і паківаўшы галавой, пачаў прабірацца паміж столікаў.

Прыяцеляў „заходнікаў“ было некалькі чалавек. Сядзелі ўжо падвыпітыя і пасалавелыя. „Паўлюк — Палач“ былы „дэфэнзыўшчык“, а цяперашні сябра Менскае „чэка“ сядзеў у сяродцы блізка прыхіліўшысь да артысты Юркі і нешта ўсё яму нашэптываў. Той, баючыся „чэкісты“, пляскаў п'янымі выпучанымі ў гару вачыма і ўдаваў, што слу-

НЯУДАЛАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ У АУСТРЫІ.

У Вене выбухла неспадзеўкі рэвалюцыя, выкліканая наступным ніштожным фактам. Венскі суд прысяжных засядацеляў апраўдаў двух братоў нейкіх Юзэфа і Гэроніма Чарманавых, абвінавачаных у тым, што ў часе праходу па вуліцы сацыялістычнай работніцкай арганізацыі „Schutzbund“ стрэлялі праз вакно і застрэлілі нейкага ваеннага інваліда Смарціса і 8-мі гадовага хлопца Грэсінга. Гэтыя два забойцы належалі да нацыялістычнай арганізацыі „Frontkaempfer“, варожа адносячайся да сацыялістычнай арганізацыі „Schutzbund'a“. Як тая, гэтак сама і другая маюць свае легальнае вааружэньне, баёўкі, і між якімі часта бываюць крывавыя спатычкі. Апраўданьне венскім судом прысяжных засядацеляў гэтых двох забойцаў і паслужыла сыгналам для „рэвалюцыі“.

На другі дзень пасьля прысуда пачаліся ў месьце дэманстрацыі работнікаў, падбухторываемых камуністамі. Дэманстранты ў першы дзень прыйшлі да цудоўнага гмаху суда, падпалілі яго і недапускалі пажарнай стражы да тушэньня пажэру. Палац згарэў з усімі судзебнымі актамі. Затым тоўпы дэманстрантаў прабавалі некалькі разоў прарвацца да гмаху парлямэнту і палацу канцлера Зэйпеля, але гэтаму перашкодзіла паліцыя. У многіх мейсцох дайшло да крывавых спатычак між паліцыяй, якая ня ў сілах была справіцца з 200—300,000 масаю рабочых і апошнімі. Былі выкліканы на падмогу вайска, але два палкі адмовіліся стрэляць у работнікаў. Частка іх перашла на бок дэмастрантаў, нарэшце яны былі разаружаны трэцім палком і інтэрнаваны ў казармах. Апрача паліцыі за парадкамі наглядалі сацыялістычныя баявыя арганізацыі, якія падпарадкаваліся толькі сац. прэзыдэнту места Зейцу. Стварыліся два цэнтры: дзяржаўны ў палацу канцлера Зэйпеля і работніцка-рэвалюцыйны у рэдакцыі рабочай газ. „Arbeiter Ztg.“

На другі дзень сац.-дэмакр. партыя праклямавала агульную забастоўку ў месце і на правінцыі, якая ахапіла тэлеграф, тэлефоны, трамваі, жэлезную дарогу і фабрыкі. Сувязь з вонкавым сьветам падтрымлівалася толькі пры помачы аэрапланаў. У месьце пачаліся грабяжы. Жыхары баяліся выйсьці на вуліцу. Толькі між паліцыяй, сацыялістамі і камуністамі часта даходзіла да перастрэлак.

У гэты час адбываліся перагаворы між сацыялістамі і Зэйпелем. Першыя жадалі, каб тойчас падаў да дымісыі цэлы ўрад і быў звольняны камэндант паліцыі. Але Зэйпель рашуча заявіў, што гэта зробіць толькі па вымаганьню нацыянальнай рады, калі яна выразіць ураду вотум недаверра. Але нацыянальная рада (аўстрыйскі парлямэнт) будзе склікавы толькі пасьля таго, як наступіць нармальнае жыцьцё ў сталіцы і на правінцыі. У гэты час сацыялісты пачалі пераконывацца ў бязсэнсовасьці і небясьпецы гэтай „рэвалюцыі“, якая можа кончыцца толькі на карысьць камуністаў і вонкавых ворагаў Аўстрыі. Дзеля гэтага на трэці дзень, у нядзелю яны выдалі загад работнікам, каб спынілі дэманстрацыі і прыступілі да працы. Ужо ў нядзелю места зноў ажывілася. А ў панядзелак наступіла зусім нармальнае жыцьцё: пайшлі трамваі па месту, таксамэтры, адкрыліся магазыны, тэатры, кафэ, рэстараны. Запалоханыя жыхары зноў выйшлі на вуліцу і ў сады. Толькі паасобныя групкі камуністаў яшчэ прабавалі дзенебудзь справакаваць крывавую спатычку між работнікамі і паліцыяю.

МАСКОУСКАЯ РУКА У ВЕНСКІХ БЕЗПАРАДКАХ.

Аўстрыйскія газэты паведамляюць, што крывавая венская рэвалюцыя была выклікана агітацыяй маскоўскіх агітатараў. У апошнія тыдні прыбыла да Вены шмат бальшавіцкіх агітатараў, якія вялі сваю працу ў рожных прадпрыемствах. Сярод 34 арыштаваных камуністаў знаходзіцца 9 маскоўскіх.

З АЭРАПЛЯНУ ДА ТУРМЫ.

Нямецкі камуністычны пасол рэйстагу Пік выляцеў у суботу з Бэрліна да Вены з мэтаю „раздмухіваць рэвалюцыю“. Венская паліцыя арыштавала яго і пасадзіла ў турму за подбухторываньне рабочых. Пры ім былі знойдзены інструкцыі нямецкай камуністычнай партыі для венскіх камуністаў.

У Вене спакойна.

У Вене наступіў поўны спакой. Хаўтуры ахвяраў адбыліся ўчора ў 2 гадзіне. Лічба ахвяраў дасягае 100 забітых і 1,000 раняных.

Біцьце па пустому мейсцу.

Маскоўскі камуністычны інтэрнацыянал выпусьціў трэці маніфэст да венскіх работнікаў. Маніфэст заклікае венскі пралетарыят да вааружэньня, тварэньня работніцкіх батальёнаў, разаружэньня паліцыі і нацыянальных арганізацыяў, праклямаваньня гэнэральнай забастоўкі і дзяржаўнага перавароту.

НАРЭШЦЕ.

Венская паліцыя арыштавала шмат камуністаў, асабліва прыбыўшых з Балканаў.

АХВЯРЫ ВЕНСКІХ БЕЗПАРАДКАУ.

Паводле афіцыяльных даных у часе венскай рэвалюцыі было забіта 67 дэманстрантаў і 2 паліцэйскіх урадаўцы. Ранена больш 100 паліцэйскіх, з якіх большасьць цяжка, а з боку дэманстрантаў 57 цяжка і 196 лёгка. Арыштавана 232 асобы. У часе рэвізыі ў рэдакцыі камуністычнай газ. „Чырвоны Сьцяг“ арыштавана 20 асобаў.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

Паўстанчаскі рух у рад. Украіне.

Комэндант 17 корпуса чырвоных войск з Вінніцы прадставіў рапарт аб павялічэньні руху паўстанцаў у Магілёўскім і Вінвіцкім вокругах. Паўстанцы, займаючыся быццам грабяжом у гэтых мейсцах, легка скрываюцца ад карацельных атрадаў чырвонай арміі, дзякуючы сымпатыі да іх мейсцовага сялянства. А калі зьявіцца малы атрад, яны хутка зьбіраюцца і разьбіваюць гэты атрад. Нядаўна паўстанцы напалі на мястэчка Брацлаў і растрэлялі 12 камуністаў і радавых урадоўцаў. У часе прасьледаваньня гэтага атраду паўстанцаў быў схоплены толькі адзін ранены паўстанец.

92 ЗАМАХІ НА УКРАІНЕ.

Камісар унутраных справаў украінскай радавай рэспублікі Балiцкі заявіў, што ў працягу траўня і чэрвеня гэт. г. на Украіне было зроблена 92 замахі на партыйцаў, служачых у партыйных інстытуцыях. У 77 выпадках былі сьмяротныя вынікі. Абнаружана 18 віноўнікаў, з якіх 11 растрэляны.

АРЫШТЫ 400 ЭСТОНЦАУ.

З Рэвеля паведамляюць, што у Рад. Расеі арыштавана каля 400 эстонцаў, сярод якіх знаходзіцца некалькі камуністаў, прылучыўшыхся да апазыцыі.

АДТРЫМАНА АРУЖЖА ПА ПАДЛОГУ.

Па падложным дакумэнтам адтрымана з маскоўскага арсэналу быццам для фармуемага эскадрону спэцыяльнага назначэньня невядомымі асобамі, прыехаўшымі ў ваеннай форме на грузавым аўтамабіле 800 руж'яў кавалерыйскага абразца з 18,000 патронаў і 100 рэвальвэраў сыстэмы Нагана з 1500 патронамі. Падлог быў абнаружаны, калі да складу прыбылі запраўдныя прадстаўнікі эскадрону Г. П. У. Пачалося энэргічнае расьледаваньне.

БЕЗ ПАРЫ РАДАСЬЦЬ.

У адказ на безпарадкі венскіх работнікаў камсамол арганізаваў 16 ліпня ў Менску рад дэманстрацыяў і мітынгаў пад лёзунгам: „Помач аўстрыяцкаму пралетарыяту“. Цэлы дзень хадзілі па вуліцы групы камуністаў з транспарантамі і штандарамі. Работнікі і ўрадаўцы былі звольняны з працы пад варункам, што прыймуць удзел у дэманстрацыях. У дэманстрацыі гэтак сама прыймалі ўдзел чырвонаармейцы.

„ЗЬВЯЗДА“ ПА БЕЛАРУСКУ.

У зьвязку з правядзеньнем беларусізацыі ваенных і цывільных інстытуцыяў на тэрыторыі Радавай Беларусі, афіцыяльны арган Радавай Беларусі „Зьвязда“ будзе з пачатку наступнага месяца друкавацца ў беларускай мове. У расейскай мове будзе выхадзіць газ. „Рабочій“.

УЦЯКАЮЦЬ З ПАРТЫІ.

У Арэха—Зуеўскім раёне каля Масквы ў працягу аднаго месяца пададзены 52 заявы аб выхадзе з кам. партыі. Усе вышаўшыя — работнікі. Матыў — перагружаннасьць партыйнаю працаю і байкот з боку безпартыйных.

БУДУЧАЕ ПАКАЛЕНЬНЬНЕ.

„Наша будучыня ў дзецях“.
(З бальшавіцкіх лёзунгаў).



ЦЯПЕРАШНЯЕ І БУДУЧАЕ.

хае ўважна. Але ёрзаў на крэсьле, вычакаючы мамэнту, каб юркнуць ў іншы куток салі, дзе яму даўно падміргвала Любачка і вачамі паказвала мейсца побач з сабой.. Супроці іх набіваў свае тоўстае пуза Судзейскі сьледчы, былая ўтрыманка эміграцыйнае беларускае эсэраўшчыны. Ен еў з жаднасьцю і гэтак галасна прысмоктываў, што суседняя „нэпманоўская“ кумпанія дэманстратыўна перасела за іншы столік. Але ён не зьвяртаў увагі, — еў, жаваў і толькі, калі не-калі зіркаў праз чорнае пэнснэ на салю. Вучыцель школы камсамольскае ступені сядзеў ля яго маўчком, пакручываў свае зайздросныя чорныя вусы і калі-не-калі перакідваўся слаўцом з былым эсэрам — начальнікам паштовае канторы.. Яны-то першыя і заўважылі ўваход Міхася і, прывітаўшы яго з далёка рукой, запрасілі да іхняга століка...

Ужо нарэзаліся бандыты?! — Прывітаў сваіх прыяцеляў — заходнікаў падыйшоўшы Міхась, — сволачы?!...

— Ну садзіся, садзіся, пасол .. сам пябось так сама недзе напіўся, — адклікнуліся прыяцелі. — Мы тутака “Наш адказ Чэмбэрлену“ спраўляем, а тыж па якой прычыне?..

— А гэта што?! — шварканўў на стол Міхась кіпу чырвонцаў і даляраў і схіліўшы галаву адным вокам абвёў прыяцеляў...

Артысты Юрка заварушыўся на крэсьле...

— Авансік трэба папрасіць — праняслася думка і ён зірнуў на Любачку...

— Давай грошы сюды — працягнуў руку Ванька—Палач і вочы ягоныя засьвяціліся нядобрым вагнём...

— Што ?! — Рукі прэч?!... „Прэзрэнны метал“ гэта мой, маім потам зароблены!... Чытай?! — і ён выцягнуў нумар „Савецкае Беларусі“.

— Ну брат, пасол?! Паміж намі кажучы, - азірнуліся навакол прыяцелі і зашапталіся, — перахапіў ты ў сваім артыкуле, — усіх сваіх знаёмых віленскіх з балотам зьмяшаў..

— Сволачы, буржуі!.. Сядзяць тамака..

— Але-ж і мы не бяз грэху, і мы працавалі разам з імі ..

— І сам ты Міхась карыстаўся з іхніх, як пішаш, цёмных сродкаў...

— Дый яшчэ як?! — дадаў нехта — і сам асабіста, і жонка, і гімназія твая...

— Што казаць, — папілі мы тады іхняе кровушкі, — засьмяяўся Ванька Палач..

— Валяў Міхась! Заказывай — закрычэў артысты Юрка.

— Няхай жывуць Міхасёвыя артыкулы?!..

— Кожны працуе, як можа! Пляваць?! — ўскрыкнуў Ванька Палач —Абы грошы былі...

— Дый гарэлка не перавадзілася?!..

І кумпанія прыяцеляў пачала спачатку.

Г—ка.

КОТ і МЫШЫ.

(БАЙКА).

Ў падпольлі адновячы сваім,
Мышы радзілісь аб тым,
Як з катом-зладзеям быць,
Бо не дае ужо ім жыць.
Пачалі радзіць. Як і ў нас —
Галдзелі мышы ўсе ўраз.
Адна тут раіць — падкупіць,
Другая проста задавіць,
Або, сабраўшыся гуртой,
Пачаставаць ката лазой.
Давала кожна сваю раду,
Аднак з нарады — няма ладу!
Тут стары пацук умешаўся;
Стаяў ён з боку, прыглядаўся
На шум і гоман таго сходу.
Урэшці кажа так народу:
Паслухайце, вось тутка вам
Прастую раду на ўсё дам.
Лапоўку — кот ад вас возьме,
Але й узяўшы — загрызе;
Забіць яго? Ці хто-бы мог?
За гэта — ведайце — вастрог!
Найлепей будзе — не сварыцца
З катом ані мірыцца.
Ні ваеваць з ім, ні дружыць,
А з асьцярогай больпай жыць!

Б. Друцкі.

Тутэйшая хроніка.

— НОВЫ ПРЭЗЫДЭНТ М. ВІЛЬНІ. Прэзыдэнтам места Вільні выбраны дзяржаўны камісар м. Вільню п. Юзэф Фолеёўскі. Лаўнікамі выбраны Віктар Малешэўскі, Ян Жэйма, Ян Лэкуцьеўскі і Рыгор Абрамовіч. Усе выбраныя далі сваю згоду на выбары

— ЗАПАМОГА АХВЯРАМ ВАЙНЫ. Міністэрства працы з мэтаю аблягчыць палажэньне насяленьня, пацярпеўшага ад вайны, асыгнавала для Віленскага ваеводзтва 1, 400,000 зл., якія будуць падзеляны між паветамі ў наступны спосаб: Віленска-Троцкі — 20.000 зл. Сьвенцянскі — 160,000 Браслаўскі — 310 000, Дзісьненскі — 5,000, Пастаўскі — 160,000, Ашмянскі — 300,000, Вялейскі і Маладэчанскі — 410,000 і ў рэзэрве застаецца ў ваеводзтве — 35,000 зл.

— ЛЬГОТЫ ДЛЯ ВАЕННЫХ ІНВАЛІДАЎ. Міністэрства працы зьвярнулася да ўсіх ваяводаў з цыркулярам ад 15 ліпня, ў якім прапануе выдаць падпарадкавэным адміністрацыйным уладам распараджэньне маючае на мэце зьмену працэдуры пры падачы прылажэньняў (załączników) пры просьбах, падаваемых ваеннымі інвалідамі да Państw. Banku Rolnego. аб пазыках на прадукцыйныя мэты. Многія з гэтых „załączników“ будуць звольнены ад гэрбавай аплаты.

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

Сьвіслач.

(Воўкавыскага пав.).

17 ліпня г. г. ў м. Сьвіслачы адбыліся выбары ў мястовую раду. Уфармавалася аж 6 сьпіскаў. Жыды пашлі нягледзячы, што іх 60 проц. насяленьня ў мястэчку, толькі двумя сьпіскамі, — жыдоўскі нацыянальны блёк і жыдоўскія работнікі Першыя атрымалі 6 мандатаў, а работнікі 3 м, — разам дзевяць. Замест гэтага беларусы, як каталікі, так і праваслаўныя адтрымалі ўсяго 3 мандаты, з іх 1 радны хоць і беларус, але лічыць сябе „тутэйшым паляком“.

Калі пачалося галасаваньне, ўсюды было перапоўнена жыдоў, а беларусы, хоць гэта было сьвята, бо недзеля, дзе-недзе толькі яшчэ радзіліся, за каго галасаваць. Ня прыймало ўдзелу ў галасаваньні 433 выбаршчыкоў (вядома беларусаў) замест гэтага жыды прывозілі нават такіх старых, што неведама, ці яны дачакаюць урадаваньня новых радных. І цяпер ня будзе дзіва, што яны правялі 9 радных

Няхай будзе за прыклад адналітасьць у жыдоў для нас беларусаў. Другі раз мусіць кожны сабе уцямыць, што ня можна ігнарыраваць такой важнай справы, як выбары. Сорамна не ахвяраваць на абарону сваіх інтэрэсаў некалькі гадзін, а пасьля каб гады цярпець незадавальненьня надхогзячых выбарах да сойму, беларусы мусяць ведаць, што толькі тады можна спадзявацца лепшай долі, калі мы будзем мець сваіх шчырых прадстаўнікоў усюды. А каб іх мець, трэба цекавіцца жыцьцем, трэба шукаць прычын нашага недамаганьня. А яны ёсьць у нашым нядбальстве і няруплівасьці

Кандрат Б.

Жыцьце цемнае моладзі у весцы.

(Валожынскі павет).

Ужо колькі разоў пісалася ў беларускіх газэтах, аб тым, каб ня пілі паганай гарэлкі, але ўсё роўна ня слухае моладзь, а п'е, як і піла. П'юць нятолькі хлапцы, а найгорш што і дзяўчата. Я сам відзеў, як некалькі дзяўчат зайшоўшы за вугал, пілі проста з горла ў горла, без ніякае закускі. Гэта ўжо нешта падобнае на зьверскасьць, піць гэтак атруту, ды дзяўчатам. Хлапцы-ж... ды і гаварыць німа чаго. Атручываюцца нешчаснай гарэліцай, а тады... б'юцца рэжуцца.

А за што?.. За каго?.. Праз каго?..

На гэтыя пытаньні яны немы. Яны самі ня ведаюць.

Гэтак на Сёмуху ў м. Валожыне тамтэйшыя хлапцы самі з сабой пабілася, а цяпер вылізываюцца, лежачы ў шпіталі, Таму руку парэзалі, таму галаву пабілі і гэтак чалавек пятнаццаць. Аднаму, дык пераламалі руку, плечы і галаву парэзалі нажамі. Ня ведама, некалькі чалавек мусіць будуць ахвярамі гэтай крывавай стычкі.

І ці мала ёсьц гатакіх выпадкаў, ажно страх бярэ. А праз што гэтак б'юцца, стаіць пытаньне, ці гэта так трэба?

На гэта ёсьць лёгкі адказ: гэта б'ецца гарэлка, гэта атрута, гэта „чортава зельле“.

Калі-ж запытаемся ў маладых алкаголікаў: на што, дзеля чаго, з якай яны мэтай яе п'юць, дык пачуеш прыемна гучачы адказ: „каб гора забыцца!“

Не, дарагія таварышы! Вы п'еце не для таго, каб забыцца гора, бо вы праз гэту паганую гарэлку прыносіце самі сабе новае гора.

Вось мусіць цяпер добра, ляжаць пры сьмерці ў шпіталі? Гэтак вы пазбываецеся гора? гэтак вы чакаеця лепшай будучыні?..

Эх, беларуская моладзь!.. маладыя сілы! .. неразумныя юнакі! Чаго вы чакаеце?! Што вы сабе думаеце?!.

Хай-бы вы хаця палову тых грошаў аддалі на газэты, што аддаецё на гарэлку, дык-бы вы ведалі, што робіцца на сьвеце, ведалі-б, як палепшыць сваё жыцьцё, як палепшыць ураджаў зямлі і г. д.

А дзе ж нашы інтэлігэнты?!..
А можа і зусім няма?..

Не яны ёсьць!

А чагож яны маўчаць?! чаго чакаюць?! чаму не талкуюць цёмнай моладзі, што яны кепска робяць?

Не! на гэта іх няма. Ім прыемна пабачыць, калі атручаныя хлапцы пачынаюць біцца, калі пачынаецца праліцьце крыві. Яны толькі могуць „изьясняться на россійском языкѣ“, а на гэта, каб простых вясковых хлапцоў паучыць, дык іх няма.

Эх цемната... галата... бедната... Вы не палепшыце свайго жыцьця гэтак! Вы будзеце бедны матэр'яльна, гэтакімі якімі і цяпер ёсьць, яшчэ нат' горшыя.

І сьмела гавару гэта, бо пераканаўся. Датуль будзеце бедныя, пакуль будзеце піць праклятую гарэлку, пакуль не пачніцё чытаць свае газэты, сваё роднае, пісанае слова.

Дык, дарагія таварышы! няўжо-ж вам ня міла сваё пісанае слова?!. Няўжо-ж вас ня цікавяць газэты?!.

Не! гэта абсурд. Вас цікавяць газэты. Вы любіце чытаць кніжкі ў сваей роднай мове, але вам ляпей піць нешчасную атруту, гэтага ворага, які сьсе вашае сэрца, гэтую праклятую, нешчасную гарэліцу...

Дык кінце піць! маладыя сілы, юнакі. Даволі!.. Налажы кожны сабе „veto", а за гэтыя грошы выпішыце сабе газэтаў, залажыце бібліатэчку... і ці мала можна чаго зрабіць, толькі трэба мець чалавечае пачуцьце, трэба веды, трэба згуртавацца ў адзін гурток, у гурток т-ва „Прасьвета" і тады, вы маладыя сілы, зробіце, шта захочыце. Тады вы нават зможацё палепшыць сваё матэр'яльнае становішча, сваё жыцьцё, як соцыяльна, так і нацыянальна.

П. Янка.

Як выглядае Слонімшчына у цыфрах.

(ад ўласнага карэспандэнта).

Пішучы гэта, я меў на думцы пазнаёміць паваж. чытачоў „Белар. Слова"—з закуткам беларускай зямелькі—Слонімшчынай,—якая ў 1925 і 26 г. лічылася „праўдзівым гняздом камуністаў", — цяпер зусім інакш: нацыянальная думка пачала захопліваць шырокія масы сялянства і з кожным днём ёсьць ўсе больш прыхільнікаў Белар. Нац. Партыі, — праграма якой—запраўднае выяўленьне вясковых балячак і патрэбаў і, ў канцы трэба адзначыць, што зусім — рэальная?. Нацыянальная думка мае пасьпех сярод нашага сялянства — цьвёрдым даказам гэтага ёсьць выбары ў самаўрады.—Правалілі-ся з трэскам Ярэмічы ў Вільні, ня было чутна аб іх і ў нас у часе выбараў.. Ня дзіва! сэзон кончыўся — пара ў архіў банкрутаў-брахуноў"...

Кожны сьвядомы беларус павінен добра знаць сваю старонку і дзеля гэтага падаю даныя — сухія цыфры.

Ў наступных нумарох закрану зямельную справу. падрабязна разьбіраючы гэту актуальную справу для нас — сялян, малазямельных і беззямельных ў Слонімшчыне.

Агулам паверхня Сланімшчыны мае 3009 квадр. кілямэтраў, — 300921 гэктараў землі. Ў гэтым ліку ёсьць: пахатнай зямлі 190, 266 гэктар. лясоў: 89.504 гэкт. няўдобнай: 21.151 гэкт.

Пахатнай зямлі ў ўласнасьці:

а) Вёсак, пасёлкаў, хутароў і фальв. да 50 гэкт.	158.633 г.
в) Сярэдніх уласьнікаў — вышэй 50 гэкт:	22.592 г.
г) Дзяржаўных і прыватн. ўстаноў	9 041 г.
	190.266 г.

Ўласьнікі лясоў:

а) Дзяржаўных	30.000 г.
в) Вялікіх і сярэдніх абшарнікаў:	57.104 г.
г) Меставых гмінаў:	2 400 г.
	89.504 г.

Гаспадаркі:

Гаспадарак да 2 гект. ёсьць:	3.630.
„ ад 2 да 5 „	6.931.
„ 5 да 10 „	6.571.
„ 10 да 15 „	2.928.
Агулам гаспад.—	20.060.

Стасунак проц. да агульнага ліку гаспадарак:

Да 2 гэктараў — 18 проц.
Ад 2 гэкт. да 5 — 34,6 проц.
Ад 5 „ 10 — 32,8 проц.
Ад 10 „ 15 — 14.6 проц

Гаспадарак,якія лічаць больш 50 г. ў Слон. ёсьць: 71.

Ў гэтым ад 50 да 300 гэкт. „ „ 51.
Больш,чым 300 „ „ „ 20

Агульны лік насяленьня: 103.631

Ў гэтым ліку ёсьць земляробаў: 86.823.
Проц. агульн. ліку насялень. 83.7 проц.
Іншых прафэсіі: 16.808.
Проц агульн. ліку насял. 16 3 проц

Нацыянальнае пытаньне:

Беларусаў ёсьць: 75 проц.
Палякаў 20 проц.
Іншых; 5 проц.

На адзін квадратны кілямэтр прыходзіцца: 33,4 чалав.

Гушчыню насяленьня акрэсьляю гэтак: ступені 1, 2, 3, 4, і 5. Найбольш густа населяныя гміны—адзначаю 1, найменш—5. (цыфрамі).—

		насял.	Гэкт	
Дзярэчын,	II,	8.032.	13.994.	На 1 чал. 1,5 г.
Казлоўшч.	I,	8.801.	25.131.	
Бытэнь,	III	7.381.	26496.	
Дэрэўна,—		7.316,	27.567,	
Шылавіцы	IV	6 959,	33,088.	На чал. 3, 5 да 3, 8 г.
Курылавічы,		6.531,	15 964.	
Міжавічы,		6.529,	18 762.	
Чамэры		6,112,	16.168.	„ 2, 5 „
Кастровічы,		5,562,	16.901,	
Старавесь		5 524,	16.036.	
Жыровіцы,		5.117,	13.099	
Раготна,	IV	4 772,	13.808	
Дзевятковічы	V.	4.328.	17.866	

Слонімскі павет мае 13 гмінаў, 4 мястэчка, 382 вёскі.

Агульный лік пасёлкаў 631.

Есьць у Слонімшчыне, 1 бров. гарэлкі, лесапілак,—14, паравых млыноў—13, вадзяных—47, шкурных фабрык і смалярні—11.

Жалезнай дарогі ёсьць 78 кілямэтраў, шасоў, —156 кілям. вадзяных дарог, —146 кілямэтраў.

На 1000 людзей выходзіць дарог;
жалезнай—0,70 кілямэтра.
шасовай—1,50 „
вадзяной каля 9 „

Славамір.

ПА СЬВЕЦЕ.

Стыхійныя бедствы і жара.

У цэлай Эўропе і Поўночнай Амэрыцэ стаіць нябывалая жара, чарадуючаяся з бурамі і ліўнямі. У Нью-Іорку тэмпэратура ў цені 38 градусаў на Цэльсію, на палудні Расеі - 72 гр. Ц. У Францыі зьвішчаны бураю вінаграднікі ў Бардо. Гэтак сама ў Нямеччыне і радавай Расеі бура прычыніла вялікія страты.

Пісьмо

да Старшыні Бел. Нац. Рады.

Наша вёска Ушы пытаецца, ці будзе зьменена наша вучыцелька на іншую, бо хутка ўжо час адчыненьня вучэбнага году, і мы ня ведаем, ці пасылаць сваіх дзяцей да школы Калі застанецца гэта самая вучыцелька, дык дзеці нашы застануцца бяз школы,—няма чаго пасылаць іх вучыцца лаянкам і непашане да нашага духавенства і старшых.

Просім даць адказ на гэта пытаньне і раду, як быць і што рабіць?

З пашанаю

У-в.ч.

АДКАЗ: Адпаведныя крокі зроблены перад Уладамі.

Паштовая скрынка.

П. Янка. Карэспандэнцыю з прыемнасьцю зьмяшчаем. Просім у гэтым напрамку пісаць далей. Газэта будзе выслана Просьба ў т-ва „Прасьвета" перадана. Адказ на просьбу будзе хутка высланы асабіста.

Галіна. Вершы зьмяшчаем. Просім пісаць больш. Газэта будзе высылацца.

Біржа.

Даляры	8,94—8,90 зл.
Рублі зал.	4,60 зл.
Рублі сяр.	2,75 зл.
Чырвонцы	33,— зл.

Збожжа

(Віленшчына)

Жыта (100 кілагр.)	52—55, зл.
Пшаніца „ „	60—63, зл.
Ячмень браваровы	50—53, зл.
Ячмень крупяны	47—8, зл.
Авёс „ „	47—49, зл.

КЛЕД ФАРЭР.

Разумны цар.

З цыклю кітайскіх апавяданьняў „Дым опіума".

(Тлумачыў з франц. Л. М.)

Тэй парой Жоўты Цар — Гоанг Ці, вёў свой народ праз пустыню. Ішла з ім аграмадзенная таўпа. Ад рана да вечара, дзень у дзень пасуваліся яны ўперад, паслухняные за Царом. Спалі на сырой зямлі пад адкрытым небам. Ня мелі з сабой ні вярблюдаў, ні коні, цела іх было амаль што голае. Блядая іх скура, не пазалочаная яшчэ харaством далінаў Сярэдзінага царства, блішчэла на сонцы; толькі Цар быў ужо жоўты. Чорныя, грубыя іх валасы былі пакудлачаны, а на тварах ня відаць было яшчэ віякай думкі. Ніхто з людзей ня ведаў адкуль яны ішлі: ведалі аб гэтым толькі ледзяныя пустыні.

І вось яны ішлі, ішлі да страшнага лесу які кішэў драконамі, тыгрысамі і нячыстымі духамі. Вартаўнік — лес ляжаў сярод Зарочнага Царства, як сабака на гаспадарскім дабру. Кожны вечар, калі Гоанг-Ці растаўляў сваю палатку з зьвярыных скураў, якой рагі загіналіся ўверх, народ, глядзячы на палатку і на паўднёвы кругазор неба, выразна відзеў у глыбокай прышласьці палаты з гэтак сама закарпачанымі стрэхамі.

Аднаго вечара Гоанг-Ці раставіў царскую палатку на беразе шырокай ракі, якая ад таго часу стала называцца Жоўтай — Гоан-Го. Ад той рэчкі пачыналася сьцяна Зарочнага леса, Гоанг-Ці падыйшоў аж да быстрай вады. Ад цёмнага ўсходу да румянага заходу цягнуўся гэты лес, неперарываючыся.

Гоанг-Ці пачуў плач у лістох варушаных ветрам, сьвіст і скавытаньне перапужаных людзьмі драконаў, брахню тыгрысаў выгнаных са сваіх логваў, як толькі змрокам пахаладзела у паветры.

Перапужаны і зграмаджаны за Царом народ пачуў, як няпрыметна, у змроку наляцелі да іх з лесу духі. Убачыўшы столькі страхаў, шмат хто з людзей перапужаўся, затрывожыўся нават і сам Цар, які, як ведама, быў вельмі адважны да дзікіх зьвяроў і нячыстых духаў. Зразумеў, ён колькі цяжкай працы трэба будзе пакласьці у прышласьці, каб пабудаваць Зарочнае Царства.

Але калі Заход пацямнеў, Гоаг-Ці вярнуўся у сваю палатку. Ніхто ня угледзіў смутку на яго цьвёрдым твары Узыйшоў месяц, а людзі што былі на варце, прывялі да Цара нейкага незнаёмца. Незнаёмец гэты быў падобны да іншых людзей, толькі меў шэсьць рук і румяны твар. Нічога ня гутарычы, бязсупынку сьмеяўся ён. Увайшоў ў палатку і сеў. Гоанг Ці, сам бог, дагадаўся, што чужаземец быў таксама богам. Верючы у Боскую дапамогу, як і ў тайны хаўрус, выправіў ён сваіх слугаў і астаўся сам-на-сам з госьцям.

Доўгі час сядзелі яны адзін побач другога у падвойным крэсьле з сланёвай косьці, выкладаным перлямутравай разьбой і глядзелі адзін на другога. Нарэшце супакой апусьціўся на зямлю і разаслаўся па ей. Лясныя духі, з незадаволенымі мінамі незразумела адступіліся, усё роўна як-бы па загаду незнаёмага.

Як доўга не глядзеў Гоанг-Ці на твар незнаемца, ня мог нічога адчытаць. Незнаёмец-жа увесь час скрыта сьмяяўся.

Па першых пеўнях госьць лёг з лева. Цар ня спускаючы з яго вачэй, заўважыў, як ён тры разы моцна засоп. І адразу магічным способам, вырас бамбук, потым мак, а нарэшце зьявілася полымя.

Незнаёмы перамешаў бамбук і сарваў мак. Ад чараўніцтва на бамбуку зьявілася залатая і яхонтавая аздоба, а пераломанае каленца разшырылася у трубку. З макаўкі пацёк сок падобны да чорнага мёду Была гэта першая люлька і першы опіум. Бажок, узяўшы люльку ў губы і паднёсшы опіюм да агню, закурыў.

Стала тады у палатцы страшна. Цудоўны пах, з якім ня могла зраўняцца ні водная парфума, розыйшоўся цяжкімі клубамі, расьцяліўся па зямлі і падняўся узерх, дайшоў аж да Жоўтага Цара. Цар, як трэба было, лёг справа, тварам да курыльшчыка, узяў сваёй чаргой люльку і закурыў.

У ап'яненьні на Гоанг-Ці найшла мара. Лёгкія сьцены палаткі зрабіліся празрыстымі, паказаўся за імі лес-вартаўнік Царства. Здалося Цару, што ужо праляцелі цэлыя стагодзьдзі, Гоанг-Ці ўбачыў сьпярша, як народ перайшоў раку і увайшоў у лес.

Страшны паход! Кінуў лес на чужынцаў цэлую армію духаў і патвораў. Дрэвы прытуліліся адно да другога і пазьвязываліся моцнымі ліянамі, якія у меру, як іх секлі, паноўна адрасталі. Балоты падаўжаліся, пашыраліся і залюдняліся крывавымі, людаеднымі духамі, якія на сьмерць упіваліся у цела таго, хто пераступаў іх межы, чалавек той бляднеў, трусься, ляскаў зубамі, даставаў гарачкі, блюзьніў і хутка паміраў сярод страшэнных мараў. Другія бажкі, легкія драконы падымаліся у паветра, леталі, а потым сьмяротным дажджом валіліся на зямлю і болі не падымаліся. Зьвяры ішлі на помач богам. Ядавітыя змеі прытаіваліся пад сухімі лісьцямі. Тыгрысы скакалі і за кожным скокам уносілі ў сваіх пазурох ахвяру. Страшэнныя ланы кінуліся ў пагоню за людзьмі і пакідалі па сабе крывавыя сьцежкі высланыя людзкімі трупамі. І кожны крок Цара і народу каштаваў болі крыві як доўгая бойка. Але яны пасуваліся усё ж такі наперад і па троху бяз упынку розчышчалі, лес. Нарэшце лесу не стала.

Тады даліна сярэдзіны Царства голая, але няплодная, пакрытая стэпамі, вазёрамі і балотамі, разасьлалася без канца. І народ сярод даліны глядзеў на сваю працу і на тое, што трэба было зрабіць. Усе тыя што разчышчалі лес, поўміралі. Памярлі таксама іх сыны і ўнукі. Але чацьвертае пакаленьне м зольнай працай выкарчавала даліну

На макаўцы самай высокай гары, за сямью радамі гранітных тыграў убачыў Гоанг Ці свой гроб.

Пяты род араў даліну, стэпы адна за другімі праходзілі у поля Балота перарабіліся на рысавыя палі, новая зеляніна паслухняная людзям убрала Царства.

Затраўленыя тыгры пауцекалі у беласьнежныя горы. Палоўленыя слані ўпрагліся ў вазы Лятучыя драконы пагінулі, а іхнія сыны — воблакі спушчалі на зямлю пладавітыя дажджы. Народ кожную ноч разрастаўся, становіўся нязлічаным. Кабеты позалочаныя сонцам, на падабенства Жоўтага Закладчыка, Гоанг Ці сталі прыгожымі.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.